3 Бязлепкіна-Чарнякевіч, А. П. Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / А. П. Бязлепкіна-Чарнякевіч, А. А. Акушэвіч, І. Д. Воюш. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. – 295 с.

**УДК 373.5.091.3:821.161.3-1*Р.Барадулін**

***Д. Л. Казлова***

# АКТУАЛЬНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ВЫВУЧЭННЯ ТВОРЧАСЦІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА Ў ШОСТЫМ КЛАСЕ

*У артыкуле разглядаецца методыка работы з вершам Рыгора Барадуліна “Уцякала зіма ад вясны…”, які прапанаваны праграмай для вывучэння ў шостым класе. Аўтар адстойвае ідэю неабходнасці напаўнення ўрока беларускай літаратуры сучаснымі прыёмамі і формамі работы, паколькі якасны ўрок быў павінен быць не толькі насычаны інфармацыяй, але і развіваць крэатыўныя здольнасці і крытычнае мысленне навучэнцаў.*

З творчасцю Рыгора Барадуліна па школьнай праграме вучні будуць сустракацца неаднаразова. Упершыню яны пазнаёмяцца з асобай паэта, яго творам у шостым класе. Вывучэнне творчасці Рыгора Барадуліна ў дадзеным класе адбываецца ў раздзеле “Мастацкае слова: вобразнасць, выразнасць, хараство”. Вучэбная праграма ў межах тэмы ўрока прапануе разгледзець наступныя аспекты: “Рыгор Барадулін. «Уцякала зіма ад вясны…». Казачна-адухоўлены свет верша. Насычанасць паэтычнай вобразнасці. Роля ўвасабленняў і метафар у стварэнні запамінальнай карціны вясновай прыроды” [1]. Безумоўна, матэрыял, які вучні павінны засвоіць і разабраць на працягу адной гадзіны, немалы, таму будзе дарэчным дадаць да традыцыйных яшчэ і сучасныя метады і прыёмы, у першую чаргу інфармацыйна-камп’ютарныя тэхналогіі, бо яны з’яўляюцца важным інструментам павышэння якасці адукацыі і мадэрнізацыі навучальнага працэсу.

Паколькі вучні толькі пачынаюць знаёміцца з асобай пісьменніка і яго творчасцю, то на *ўступным этапе* настаўнік можа падаць біяграфічную даведку, прадэманстраваць партрэт пісьменніка або паказаць невялічкі відэаролік пра Рыгора Барадуліна. Настаўніку неабходна будзе пазнаёміць вучняў з асноўнымі этапамі жыцця і творчасці пісьменніка, яго паходжаннем, пачаткам літаратурнай дзейнасці, асноўнымі тэмамі і жанрамі. Важна адзначыць, што асаблівасцю яго творчасці была глыбокая любоў да роднай зямлі, гісторыі і мовы, а таксама ўспаміны пра партызанскі рух і цяжкасці вайны. Увядзенне біяграфічнай даведкі пры вывучэнні пейзажнай лірыкі павінна быць метадычна апраўдана, пра што мы агаварымся ніжэй. На дадзеным этапе важна падаць асноўныя звесткі пра пісьменніка, каб у далейшым, пад час знаёмства з іншымі творамі Рыгора Барадуліна, вучні мелі ўяўленне пра жыццё і светапогляд паэта, ведалі агульную інфармацыю пра яго асобу.

Паколькі гэта не паўнавартасная лекцыя па біяграфіі пісьменніка (манаграфічная тэма па яго жыццятворчасці будзе вывучацца толькі ў 10 класе), для замацавання атрыманай інфармацыі настаўнік можа прапанаваць вучням вучням крэатыўнае і займальнае заданне з выбарам фактаў, кшталту “Стварыць акаўнт пісьменніка ў сацыяльнай сетцы”. Зараз эпоха сучасных тэхналогій, людзі актыўна карыстаюцца сацыяльнымі сеткамі, ствараюць акаўнты, таму такое заданне абавязкова спадабаецца вучням, нават і шасцікласнікам. Для яго выканання настаўнік можа прапанаваць вучням стварыць профіль Рыгора Барадуліна ў Instagram, дзе ім патрэбна будзе прыдумаць крэатыўнае і сучаснае імя карыстальніка, апісанне акаўнта, ідэі для пастоў і публікацый. Для гэтага настаўнік можа загадзя падрыхтаваць раздрукаваны профіль, які кожны з вучняў запоўніць самастойна і так, як ён хоча (малюнак 1).




Малюнак 1 – Акаўнт Рыгора Барадуліна

*Арыенціровачны этап* настаўнік можа працягнуць рэпрадуктыўнай гутаркай па зместе твора, звярнуць увагу на незразумелыя словы і выразы, якія трапляюцца ў творы. Але момант тлумачэння незразумелых слоў і выразаў таксама можна зрабіць больш цікавым. Напрыклад, настаўнік можа падрыхтаваць прэзентацыю, дзе будуць змешчаны карцінкі, што адпавядаюць словам, якія патрабуюць дадатковай увагі, а таксама і іх тлумачэнне. Вучням будзе дэманстравацца карцінка, а ім трэба будзе падабраць да іх слова, калі адказ будзе правільным, то далей вучні пабачаць яго тлумачэнне. Напрыклад, мы можам разгледзець гэта на прыкладзе слова “брод” (малюнкі 2, 3).



Малюнак 2 – Слайд-выява




Малюнак 3 – Слайд-дэфініцыя

*Этап аналізу* твора настаўнік можа працягнуць з дапамогай эўрыстычнай гутаркі, для таго, каб вучні асэнсавалі ідэйны змест твора, таксама можна прапанаваць вучням падабраць асацыяцыі да слоў “вясна” і “зіма”. Акрамя гэтага, неабходна будзе звярнуцца да мастацкіх сродкаў у творы. Перш чым выконваць дадзенае заданне, трэба праверыць веды вучняў пра такі вобразна-выяўленчы сродак, як метафара. З ім яны пазнаёміліся на папярэднім уроку з дапамогай артыкула падручніка “Метафара”. Тлумачэнне паняцця “ўвасабленне” ажыццяўляецца або праз тэарэтычную даведку, або з дапамогай каменціраванага чытання адпаведнага артыкула ў падручніку. Трэба, каб вучні абавязкова на практыцы засвоілі гэта і выпрацавалі ўменні шукаць увасабленні ў творы. Для гэтага можна зноў звярнуцца да папярэдняга твора “Падаюць сняжынкі”, аўтарам якога з’яўляецца Паўлюк Трус, і папрасіць вучняў, каб яны адшукалі ў ім увасабленні. Напрыклад, у вершы Паўлюка Труса ёсць наступныя ўвасабленні: *расчасалі вішні косы, вечар адхінае мярэжы*. Далейшую працу з увасабленнямі і іншымі мастацкімі сродкамі вучні могуць працягнуць на прыкладзе вывучаемага твора.

У якасці інтэрактыўных заданняў настаўнік можа стварыць анлайн-гульню “Адкрый поле” на адукацыйнай платформе *wordwall.net*, асноўны сэнс якой заключаецца ў тым, што вучням трэба будзе па чарзе адкрываць нумары пытанняў і сярод прапанаваных адказаў абраць правільны. Такое заданне можна выконваць франтальна, вывеўшы гульню на манітор або экран, ці выкарыстаць мабільныя тэлефоны і зрабіць заданне індывідуальна, перайшоўшы па спасылцы https://wordwall.net/ru/resource/65621834/ беларуская-літаратура/рыгор-барадулін-уцякала-зіма-ад-вясны. У выніку па колькасці атрыманых балаў можна вызначыць пераможцу (малюнак 4).




Малюнак 4 – Гульня “Адкрый поле”

Можна звярнуцца да межпрадметных сувязей і ў якасці яшчэ аднаго інтэрактыўнага задання прапанаваць культуралагічнае параўнанне. Вучням дэманструецца відэакліп беларускай народнай песні “Зіма з летам сустракалася…” у выкананні беларускага спевака Сяргея Славянскага https://www.youtube.com/watch?v=BHbEB1rfqKo&t=36s. Далейшую працу з відэакліпам можна працягнуць з дапамогай наступных пытанняў:

1 Якое ўражанне ў вас ад песні?

2 Што вы адчулі падчас яе гучання?

3 Якія зрокавыя вобразы ўзніклі пры праслухоўванні? Ці дапамагае нам музыка ўбачыць малюнкі роднага краю?

4 Што агульнага і адрознага адлюстравана ў вершы і песні, як звязаны мелодыя песні і інтанацыя верша, яго настрой?

На *заключным* этапе трэба абагульніць вывучанае на ўроку, што можна зрабіць з дапамогай сінквейна – верша, які складаецца з пяці радкоў і не мае рыфмы. Трэба абавязкова правесці інструктаж і патлумачыць, як правільна гэта зрабіць. І будзе дарэчным не толькі паказаць схему, але і прывесці свой варыянт сінквейна, на які вучні будуць арыентавацца. У якасці ключавога слова можна ўзяць словы “вясна” або “зіма”.

Алгарытм працы над сінквейнам:

1 радок – назва, ключавое слова;

2 радок – два азначэнні;

3 радок – тры дзеясловы;

4 радок – сказ з чатырох слоў, які адлюстроўвае асноўную думку твора;

5 радок – сінонім ключавога слова.

Прыклад сінквейна на тэму “Вясна” можа быць такім:

Вясна

Жыццё, адраджэнне

Квітнее, грэе, натхняе

Прырода прачынаецца ад сну

Надзея

На этапе абагульнення можна скарыстацца і гатовым анлайн-тэстам, да прыкладу, па спасылцы https://eior.by/catalog_lecture/6-klass/bellit/23.php і выканаць невялікі тэст, які складаецца з пытанняў, кшталту:

Адзначце, пад якім нумарам змешчаны партрэт (фотаздымак) Рыгора Барадуліна?

*Адказ: 5*

2 Выявіце, пра што гаворыцца ў вершы Рыгора Барадуліна “Уцякала зіма ад вясны…”:

– наступленне лета;

– наступленне зімы;

– *канец зімы*;

– канец восені;

– усе поры года.

3 Назавіце эпітэты, якія ёсць у вершы Рыгора Барадуліна “Уцякала зіма ад вясны…”:

– шоўкавыя косы;

– *вербалозаў рагатых*;

– *ніцых плячах*;

– падаюць сняжынкі;

– тонкія мярэжы і г. д.

Такім чынам, інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі можна выкарыстоўваць на ўсіх этапах заняткаў. Яны з’яўляюцца дадатковым інструментам, выкарыстоўваючы які можна зрабіць працэс навучання больш эфектыўным. А правільна падабраныя інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі напаўняюць працэс навучання сучаснымі метадамі і прыёмамі, што садзейнічае якаснаму засваенню матэрыялу навучэнцамі. Знаёмства з творчасцю Рыгора Барадуліна ў шостым класе адбываецца ўпершыню, таму на ўроку мэтазгодна звярнуцца да біяграфічных звестак пісьменніка, арганізаваць працу з тропамі,

а таксама намагацца выкарыстоўваць разнастайныя інтэрактыўныя заданні на розных этапах вывучэння твора для актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці вучняў, каб гэтае знаёмства было для іх цікавым, карысным і займальным.

**Літаратура**

1 Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для VI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. – URL: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/ belaruskaya-litaratura.html (дата звароту: 22.04.2025).

**УДК 811.161.1’373.2:769.82:355**

***В. А. Кравченко***

## ОБ ОСОБЕННОСТЯХ ВИЗУАЛИЗАЦИИ ФРАЗЕОЛОГИЗМА *КОЗЁЛ ОТПУЩЕНИЯ* В СОВРЕМЕННОМ ИНТЕРНЕТ-ПРОСТРАНСТВЕ

*В статье рассматривается устойчивое словосочетание «козел отпущения» с точки зрения его визуализации. Описываются изображения, отражающие формирование внутренней формы данного фразеологизма, а также процесс приобретения свободным словосочетанием статуса семантически неделимого оборота. В отдельный тип выделены интернет-картинки юмористического содержания, основанные на обыгрывании переносного значения компонента-зоонима.*

Фразеологизм *козёл отпущения* (*искупления)* ‘о человеке, на которого сваливают ответственность за ошибки, проступки, грехи других (часто – невиновном в них)’, широко употребляется в современном русском языке. Происхождение данной фразеологической единицы связано с особым древнееврейским обрядом возложения грехов всего народа на козла. Для искупления греха приносили в жертву двух козлов, один из которых умерщвлялся «в жертву за грех», а со вторым козлом проводился особый ритуал: «В день грехоотпущения первосвященник возлагал обе руки на голову живого козла в знак возложения на него всех грехов еврейского народа, после чего козел отсылался в пустыню, “чтобы он понес на себе все их беззакония в землю непроходимую”» [1, с. 313–314].

Книжный по своему происхождению фразеологизм *козёл отпущения* регулярно используется в современной публицистической и разговорной речи. Достаточно активно это экспрессивное устойчивое словосочетание визуализируется и в современном интернет-пространстве, что обусловлено, с одной стороны, его выразительной антропоориентированной негативно-оценочной семантикой (сравн.: *белая ворона, волк в овечьей шкуре* и т. п.), а с другой – наличием в его составе слова-компонента *козел*, реализующего в разговорной речи сниженное значение ‘о человеке, вызывающем раздражение своей упорствующей глупостью’ [2, с. 437].

Интернет-иллюстрации, визуализирующие фразему *козёл отпущения*, условно могут быть разделены на несколько групп.

Первую группу составляют рисунки, в которых наглядно отображается история происхождения фразеологизма. Так, в центре рисунка 1 воспроизведён обряд древних евреев, проводимый в день искупления. Возложенные на голову козла руки символизируют «передачу» грехов народа козлу. Если данный рисунок статичен, то рисунок 2